# ПАДПОЛЬНАЯ ГРУПА СЯСЦЁР САЛАДУХІНЫХ

**Перыяд дзеяння:**

вясна 1942 г. – сакавік 1943 г.

**Месца дзеяння:**

г. Віцебск, раён 5-га цагельнага завода

**Колькасць:**

каля 5 чалавек

**Кіраўнікі:**

невядома

Дзейнічала ў Віцебску з вясны 1942 г. да сакавіка 1943 г. Група складалася з сясцёр Ганны, Галіны, Марыі і Зінаіды Саладухіных і іх маці Ганны Міхайлаўны. Дом Саладухіных знаходзіўся побач з ветэрынарным інстытутам, дзе ў час вайны размяшчалася палявая камендатура і жылі ваеннапалонныя, якія яе абслугоўвалі.

У пачатку 1942 г. патрыёткі ўстанавілі сувязь з партызанамі брыгады «Аляксея» (А. Ф. Данукалава), выконвалі іх заданні. Сёстры Саладухіны разам з камсамолкай-падпольшчыцай В. Г. Дунке ў чэрвені 1942 г. дапамаглі 6 ваеннапалонным збегчы на аўтамашыне. Сёстры наладзілі стасункі з падпольнай групай Л. Д. Бярозкінай, атрымлівалі ад яе лістоўкі і распаўсюджвалі іх. Пасля правалу групы Бярозкінай у верасні 1942 г. Саладухіны пакінулі горад. Ганна і Галіна сталі партызанскімі разведчыцамі. Зінаіда і Марыя 11 сакавіка 1943 г. былі схоплены гітлераўцамі і адпраўлены ў лагер СД, адкуль збеглі і ў студзені 1944 г. пайшлі ў Чырвоную армію.

Трое з сясцёр Саладухіных узнагароджаны медалямі.

**ЛІТАРАТУРА**

1. **Дарафеенка, Н. І.** Падпольная група Саладухіных / Н. І. Дарафеенка // Памяць: Віцебск : гісторыка-дакументальныя хронікі гарадоў і раёнаў Беларусі : у 2 кн. / рэдкал.: Г. П. Пашкоў (гал. рэд.) [і інш.] ; склад. А. І. Мацяюн ; маст. Э. Э. Жакевіч. – Мінск, 2002. – Кн. 1. – С. 495.